*Памяці воіна –інтэрнацыяналіста,*
*малодшага сяржанта,*
*былога механізатара саўгаса «Івесь”*
*Аляксандра Чаронкі.*

**САША ЧАРОНКА**

Гоні цалуе
Промнямі сонца,
Песняй жаўрук
Заліваецца звонка.
Трактар вядзе
Па тых гонях
Бясконцых
Саша Чаронка,
Саша Чаронка.

Месяц двурогі
З-за хмар паказаўся
Шчасце, каханне
маё ты,
Алёнка…–
З любой сваёй
Усю ноч красаваўся
Саша Чаронка,
Саша Чаронка.

Граюць музыкі.
Ісці час паходняй,
З дому сцяжынка
Бяжыць да сасонкі,
Слёзы
Змахнула матуля:
– Мой родны
Саша – сыночак,
Саша Чаронка.

Горы далёкія
Афганістана,
Ні аблачынкі
Чужая гамонка.
Б’е кулямётчык
Зладзеяў – душманаў
Саша Чаронка,
Саша Чаронка.

Зноў бой
Кінжальны.
Побач дувалы…
– Маці… Алёнка…
Мая ты старонка…
Скошаны куляй,
Упаў каля скалаў
Саша Чаронка,
Саша Чаронка.

Смутак, туга,
Такі боль
Чалавечы.
Слёзы – расінкі
На кветках
Рамонкаў.
Памятаць
Будзем цябе, ведай,
Вечна,
Саша Чаронка,
Саша Чаронка.

***І. Волкаў, настаўнік***